УДК 947.6

# ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ І ІДЭЙНАЯ СПАДЧЫНА МІХАІЛА ВОСІПАВІЧА КАЯЛОВІЧА

Я. С. ЛАБАЧЭЎСКАЯ
Навуковы кіраўнік В. В. АРЦЁМЧЫК
БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Міхаіл Восіпавіч Каяловіч (1828–1891 гг.) – па сваіх поглядах быў блізкі да панславістаў і сцвярджаў ідэі ліберальнага заходнерусізму. Паходзіў з Сярэдняга Панямоння – сумежжа беларускага, літоўскага і польскага этнасаў. Яго маладосць і пачатак навуковай дзейнасці супалі з гадамі ўзрастання на глебе польскай асветы і культуры парасткаў сепаратызму мясцовых паноў, што вызначылася ў паўстанні 1860-х гг. за аднаўленне Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Літвы і Беларусі, таму малады навукоўца вырашыў змагацца за спрадвечна рускую зямлю сродкамі навукі. Яго сям’я захавала беларускі побыт, мову, звычаі і падтрымала ўваходжанне Беларусі ў склад Расіі. Бацька М. Каяловіча – уніяцкі святар перайшоў у праваслаўе, імкнучыся да аднаўлення страчанай пад прамусам Польшчы першапачатковай рэлігіі беларусаў. Савецкая навука адмоўна адносілася да асобы даследчыка, бо ён лічыў Расійскую імперыю сваёй краінай. Галоўнай яго мэтай было высвятленне прынцыпаў жыцця карэннага насельніцтва Заходняй Расіі; прычын, якія разбілі адзінства жыцця старадаўняга рускага грамадства; вызначэне тых падстаў, якія здольныя аднавіць яго. У кнізе “История русского самосознания” (1884 г.), першай абагульняючай гістарыяграфічнай працай у Расіі, ён сцвярджаў, што гістарычнае даследаванне павінна максімальна даказальна абгрунтоўваць пазіцыю, прымальную для сумлення даследчыка. Разуменне “рускасці” яго творах адпавядае сучаснаму разуменню грамадзянскай нацыі. Паходзячы з беларускага асяроддзя, ён адмаўляў права беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў на нацыянальнае самавызначэнне і супрацьстаяў небяспеке пераходу ад этнаграфізму да сепаратызму, што, на яго думку, будзе выкарыстана Польшчай і павялічыць яе моц за кошт Белай Русі. Ён прапанаваў пашырыць межы заходнерускіх губерній за кошт часткі губерняў Царства Польскага, якія часткова былі населены беларусамі, літоўцамі і ўкраінцамі. Адным з першых у этнаграфіі Каяловіч прапанаваў выкарыстанне беларускіх дыялектаў у якасці асноўнай прыкметы для вызначэння этнічнай тэрыторыі беларускага насельніцтва. Развіццё беларускай літаратурнай мовы дапушчалася, калі новая “книжная” мова не будзе перашкаджаць рускай і не парушыць славяна-рускага адзінства. Руская літаратурная мова разглядалася як фактар аб’яднальны для ўсходнеславянскага насельніцтва, таму, што гістарычна ў яе стварэнні прымалі усе рускія народы: вялікаросы, беларусы і маларосы. Дзейнасць М. Каяловіча з’явілася значным фактарам адраджэння беларускай культуры і свядомасці як неад’емнай часткі славяна-рускай цывілізацыі.